**УДК 947.6"1921–1939"** **DOI 10.52928/2070-1608-2024-71-3-61-66**

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПАМЕШЧЫЦКАГА ЗЕМЛЕЎЛАДАННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921–1939 гг.

***канд. гіст. навук, дац. В.П. ГАРМАТНЫ***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)***
***e-mail: vitharmatny@mail.ru***

*На працягу 1921–1939 гг. Заходняя Беларусь з'яўлялася часткай народна-гаспадарчага комплексу міжваеннай Польшчы з выразным дамінаваннем тут сельскай гаспадаркі і захаваннем вялікай колькасці памешчыцкіх гаспадарак, побач з якімі існавалі шматлікія гаспадаркі малазямельных сялян, што спадзяваліся атрымаць зямлю з маёнткаў. Нягледзячы на значны ўнёсак памешчыкаў у развіццё мясцовай гаспадаркі, як айчынныя, так і замежныя даследчыкі па розных прычынах засяроджвалі сваю навуковую ўвагу ў першую чаргу на становішчы мясцовага сялянства, на той час як памешчыцкая гаспадарка заставалася па-за ўвагай і падавалася даволі аднабакова і суб'ектыўна.*

***Ключавыя словы:*** *памешчыкі, землеўладанне, ураджайнасць, гаспадарка, латыфундыя, маёнтак, Палессе.*

**Уводзіны.** Асноўнай галіной эканомікі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. па-ранейшаму заставалася сельская гаспадарка, менавіта тут была занята дамінуючая частка мясцовага насельніцтва, пры гэтым з усіх заходнебеларускіх ваяводств найбольш выразны сельскагаспадарчы характар насіла Палескае з цэнтрам у г. Брэст-над-Бугам. Неабходна адзначыць істотную дыспрапорцыю ў землекарыстанні, якая праяўлялася ў захаванні вялікай колькасці буйных (згодна ацэнак савецкага часу – памешчыцкіх) латыфундый, побач з падаўляючай большасцю навакольных мала- і беззямельных сялян, у сувязі з чым аграрнае пытанне стаяла на той час вельмі востра і патрабавала ад уладаў тэрміновага вырашэння. Дзякуючы свайму надзвычай высокаму дабрабыту памешчыкі маглі дазволіць сабе надзвычай шыкоўныя тавары, адным з яскравых праяў чаго стаў легкавы аўтамабіль, а таксама магчымасць найму на працу з-за мяжы кухарак і гувернантак, што не магло не выклікаць зайздрасці і непавагі да іх з боку навакольных жыхароў.

Памешчыцкае землеўладанне адыгрывала важнейшую ролю ў эканоміцы тагачаснай Заходняй Беларусі, заставалася адной з галоўных крыніц пастаўкі прадуктаў на ўнутрыпольскі рынак і на экспарт, але, разам з тым, неабходна падкрэсліць адсутнасць буйных комплексных прац, прысвечаных вывучэнню менавіта памешчыцкага гаспадарання ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Адначасова асобныя бакі разглядаемага пытання знайшлі адлюстраванне ў даследаваннях папярэднікаў, падцвярджэннем чаму з'яўляецца першая абагульняючая праца В.А. Кахновіча [1], у якой разгледжана адлюстраванне айчыннай гістарыяграфіяй праблем буйной зямельнай уласнасці Заходняй Беларусі міжваеннага перыяду, падкрэсліваецца больш высокая яе ўраджайнасць у параўнанні з сялянскай, а таксама заідэалагізаваны падыход да яе з боку істотнай колькасці айчынных навукоўцаў. У артыкуле раскрыта эвалюцыя поглядаў беларускіх аўтараў на месца і ролю буйнога землеўладання ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гг., а таксама асноўныя нявырашаныя праблемы. Гэтае землеўладанне, у цэлым, акрэслівалася як памешчыцкае і як перашкода на шляху сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця беларускага народа, аднак, апошнім часам погляд на гэты прадмет становіцца больш узважаным і ўсебаковым.

**Асноўная частка.** Навуковае вывучэнне асобных аспектаў памешчыцкага землеўладання Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. пачалося яшчэ ў азначаны перыяд. Першым з айчынных даследчыкаў, хто ў асобным буйным выданні звярнуў увагу на становішча тут памешчыцкага землекарыстання, стаў Л. Гак [2]. Згодна пануючай на той час у айчыннай гуманітарыстыцы марксісцка-ленінскай метадалогіі і тэорыі класавай барацьбы, у ягонай працы на аснове, перш за ўсё, матэрыялаў заходнебеларускага перыядычнага друку і справаздач камуністычных актывістаў яскрава і нават у некалькі карыкатурнай форме падкрэслівалася няшчадная эксплуатацыя памешчыкамі сялян, дзякуючы чаму і забяспечвалася дамінаванне памешчыцкага землеўладання, якое адначасова знаходзіла поўнае ўзаемаразуменне і падтрымку з боку польскіх улад.

На больш высокім навуковым ўзроўні выканана даследаванне І.І. Гальдштэйна [3], у якім з эканамічных пазіцый грунтоўна прааналізавана тагачаснае землеўладанне на тэрыторыі міжваеннай Польшчы, а таксама яго спецыфіка на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, якая праяўлялася менавіта ў захаванні і дамінаванні памешчыцкага землеўладання. У разглядаемай працы паказаны памеры памешчыцкіх гаспадарак і арганізацыя тут гаспадарання, падкрэсліваецца, што больш высокай ураджайнасці ў параўнанні з сялянамі памешчыкі дабіваліся менавіта дзякуючы актыўнай эксплуатацыі сялян, шырокага выкарыстання сельскагаспадарчых машын і, найперш за ўсё, мінеральных угнаенняў.

У цэлым прадстаўнікі айчыннай гістарыяграфіі савецкага перыяду не разглядалі асобна дадзенае пытанне, але некаторыя звесткі ўтрымліваюць выданні, прысвечаныя рэвалюцыйна-дэмакратычнаму руху заходнебеларускага сялянства міжваеннага перыяду, яскравым прыкладам чаму з'яўляецца манаграфія А.М. Мацко з красамоўнай назвай [4]. У сувязі з гэтым памешчыцкае землеўладанне ацэньваецца ім выразна негатыўна, адзначаецца эксплуатацыя памешчыкамі сялян, якія вялі з імі таму пастаянную барацьбу за свае правы, перш за ўсё, адносна

права землеўладання. Дадзеная барацьба ў многім праяўлялася ў незаконным выпасе жывёлы на палях буйных землеўласнікаў, вырубцы леса, збіцці прадстаўнікоў адміністратыўнага персанала і нават, у выключных выпадках, падпальванні памешчыцкіх маёнткаў і асадніцкіх (перасяленцаў-каланістаў з карэннай Польшчы) сядзіб.

А.А. Сарокін у сваёй грунтоўнай працы даследаваў аграрнае пытанне ў Заходняй Беларусі падчас яе знаходжання пад польскім панаваннем, пры гэтым зрабіў акцэнт на становішчы найбольш бяднейшай часткі насельніцтва, рэзка супрацьпастаўляючы яго памешчыкам, якія па нацыянальнасці былі, у асноўным, палякамі. У выданні адзначаецца, што памешчыцкае землеўладанне было перажыткам часоў феадалізму, а сяляне непазбежна траплялі ў залежнасць ад памешчыкаў. Пры гэтым ва ўмовах далейшага развіцця ў міжваеннай Польшчы капіталістычных адносін паводле так званага "прускага шляху" памешчыкі вымушаны былі прыстасоўвацца да новых патрабаванняў з мэтай захавання буйнога землеўладання, якое, на думку даследчыка, ужо даўно даказала сваю рэакцыйнасць і неабходнасць ліквідацыі [5].

Манаграфія Б.Я. Кухарава працягвае прынятыя ў айчыннай гістарыяграфіі савецкага перыяду высновы адносна месца і ролі памешчыкаў у тагачасным землекарыстанні, ацэньвае іх адназначна негатыўна. Аўтар разглядаемай працы падкрэслівае, што на той час у памешчыцкіх гаспадарках ужо ўсталявалася спецыялізацыя па розных напрамках ажыццяўлення сельскай гаспадаркі, што стала адной з яскравых прыкмет станаўлення тут капіталістычных адносін. Акрамя таго, слушна адзначаецца, што ў выніку парцэляцыі (продажу сялянам часткі панскіх зямель) большую частку надзелаў з былых памешчыцкіх маёнткаў атрымлівалі не navakольныя сяляне, а асаднікі, у выніку чаго агульная эканамічная сітуацыя на вёсцы, па сутнасці, заставалася катастрафічнай [6]. У сувязі з гэтым у выданні падкрэсліваецца неабходнасць поўнага скасавання памешчыкаў як катэгорыі ўласнікаў і перадачы ўсёй панскай зямлі сялянам бясплатна, што можна было вырашыць толькі рэвалюцыйным шляхам. У якасці адной з такіх праяў няшчаднай эксплуатацыі і таннасці сялянскай працы ў цэлым адзначаецца наяўнасць усяго некалькіх трактароў у памешчыцкіх маёнтках на ўсю Заходнюю Беларусь.

І.В. Палуян усебакова паказаў сацыяльна-эканамічнае развіццё Заходняй Беларусі ў перыяд сусветнага эканамічнага крызісу 1929–1933 гг., разгледзеў становішча асноўных грамадскіх класаў, у тым ліку і памешчыкаў, якія ацэньваліся адназначна адмоўна, выступалі ў ролі эксплуататараў. Так, напрыклад, на той час памешчыкі складалі менш 1% землеўласнікаў і пры гэтым засяродзілі ў сваіх руках больш 50% землекарыстання. Сваю зямлю памешчыкі пераважна здавалі сялянам у арэнду, што, па сутнасці, разам з распаўсюджанай практыкай аплаты сялянскай працы прадуктамі можна было ацаніць як працяг прыгоннага ладу. Акрамя таго, паміж памешчыкамі і сялянамі цягнуліся шматлікія працяглыя судовыя працэсы наконт сервітутаў – права агульнага карыстання зямельнай маёмасцю (лясамі, рэкамі, пашамі і г.д.), якія ў дамінуючай большасці заканчваліся на карысць памешчыкаў [7].

На сучасным этапе першым, хто звярнуўся да вывучэння азначанай тэмы, стаў В.С. Місіюк [8], які распавёў пра лёс буйнога памешчыцкага землеўладання Заходняй Беларусі ў кантэксце агульнай трансфармацыі і, перш за ўсё, аграрнай рэформы, пра іх спробы рэарганізаваць свае гаспадаркі да выклікаў новага часу, што часцяком суправаджалася нежаданнем страчваць свае даўнія прывілеі і традыцыі. У артыкуле падкрэсліваецца, што буйныя гаспадаркі размяшчаліся на слабаўрадлівых землях і таму з-за гэтага вымушана засяроджваліся на лясной гаспадарцы.

У біяграфіі Р. Скірмунта, падрыхтаванай А.Ф. Смалянчуком, падрабязна разглядаецца арганізацыя гаспадарання ў ягоным маёнтку Парэчча Пінскага павета Палескага ваяводства, адзначаецца яе высокі ўзровень (у публіцыстычнай форме вёска была нават вядома як "Ліверпуль-на-Ясельдзе"), падкрэсліваюцца ягоныя заслугі ў гаспадарчым аднаўленні маёнтка пасля разбурэнняў падчас Першай сусветнай вайны і спрыяльныя ўзаемаадносіны з мясцовымі сялянамі дзякуючы актыўнай матэрыяльнай дапамозе патрабуючым таго вяскоўцам, падцвярджэннем чаго, напрыклад, з'яўляецца пытанне аднаго з іх: "чаму ў пана няма сям'і?" [9].

Артыкулы А.М. Вабішчэвіча прысвечаны ардынацыям Радзівілаў і асабліва Давід-Гарадоцкай, якая з'яўлялася найбольш буйным памешчыцкім маёнткам на тэрыторыі Заходняй Беларусі на той час. У разглядаемых працах паказаны формы, метады і асноўныя напрамкі гаспадарання, адзначаюцца складаныя ўзаемаадносіны з мясцовымі сялянамі, перш за ўсё, з-за супярэчнасцей адносна ўзроўню аплаты іх працы і памеры ворнай зямлі, якія неабходна было перадаць на выкуп вяскоўцам [10–11]. Акрамя таго, у асобным выданні, прысвечаным гісторыі роднай вёскі Рубель, прааналізавана сістэма мясцовага землекарыстання ў 1921–1939 гг., падкрэсліваецца, што мясцовых Радзівілаў сяляне з павагаю называлі нават не "панамі", а "князямі", і з ахвотай наймаліся да іх на працу [12].

Не абмінула ўвагай Давыд-Гарадоцкую ардынацыю Радзівілаў і В.М. Папко, якая з'яўляецца аўтаркай адпаведнага артыкула, дзе прасочвае гісторыю ардынацыі з 1905 г. па 1939 г., перш за ўсё яе эканамічную дзейнасць, якая канцэнтравалася вакол велічэзных мясцовых лясных масіваў і вадаёмаў. У артыкуле адзначаецца ўдзел Радзівілаў у ажыццяўленні аграрнай рэформы. Магнаты былі не зацікаўлены ў абмежаванні сваіх надзелаў і прадпрымалі шэраг мер па супрацьдзеянні (перш за ўсё, дзякуючы вызначэнню сваіх маёнткаў як першакласных і таму непадпадаючых пад падзел), што ім у цэлым удалося. Значную цікавасць выклікае той факт, што на пачатку 1920-х гг. у Польшчы ўводзілася абавязковае страхаванне здароўя некаторых катэгорый наёмных работнікаў, але мясцовы магнат Караль Радзівіл своечасова пра гэта не паклапаціўся, таму быў аштрафаваны. Вялікае значэнне ў навуковым плане мае таксама прыведзены даследчыцай спіс супрацоўнікаў ардынацыі і функцыянал іх дзейнасці [13].

Разам з тым, В.М. Папко галоўную ўвагу ў навуковым плане прысвяціла роду Дзяконскіх і выдала на гэтую тэму асобную кнігу, у якой распавяла пра арганізацыю гаспадарання ў іх маёнтках [14]. Нягледзячы на тое, што дадзены род не быў самым багатым і ўплывовым на Палессі, у ягоных маёнтках укараняліся дастаткова перадавыя і эфектыўныя метады гаспадарання. Акрамя таго, даследчыца падкрэслівала, што згодна дзеючаму заканадаўству прымусоваму выкупу не падлягалі землі маёнткаў з высокім узроўнем арганізацыі гаспадарання, таму

многія мясцовыя памешчыкі карысталіся гэтымі абставінамі з мэтай захаваць свае ўладанні ад пераходу ў сялянскія рукі. Вялікую навуковую каштоўнасць мае расповяд пра ўзаемаадносіны сялян Пружанскага і Кобрынскага паветаў са сваімі панамі. Падкрэсліваецца пры гэтым, што найбольш складаныя ўзаемаадносіны ў вяскоўцаў назіраліся нават не са самімі землеўласнікамі, а з іх аканомамі, якія непасрэдна займаліся справай арганізацыі гаспадарання ў памешчыцкіх маёнтках.

Т.А. Калеснікович займалася вывучэннем памешчыцкага землекарыстання на тэрыторыі сваёй малой радзімы – цяперашняга Камянецкага раёна, які на той час з’яўляўся часткай Брэсцкага павета Палескага ваяводства. Даследчыца адзначае высокі ўзровень арганізацыі працы ў пераважнай колькасці мясцовых памешчыцкіх гаспадарак, што ўдавалася дасягнуць дзякуючы адпаведнаму кваліфікаванаму персаналу. У разглядаемай працы прасочваецца тэхнічная абсталяванасць мясцовых памешчыцкіх гаспадарак, што ў многім абумоўлівала поспехі ў апрацоўцы зямлі [15].

Артыкул У.В. Здановіча прысвечаны сацыяльна-эканамічнаму развіццю гміны Валовель Драгічынскага павета Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг., у тым ліку, разглядаецца арганізацыя гаспадарак і дзейнасць мясцовых памешчыкаў падчас парцэляцыі, дзякуючы якой вяскоўцы ўсімі сіламі намагаліся стаць самастойнымі гаспадарамі і быць незалежнымі ад сваіх памешчыкаў [16].

Што датычыць польскай гістарыяграфіі, то першую комплексную працу па разгляду аграрнай гісторыі міжваеннай Польшчы і ў тым ліку памешчыцкага землеўладання выпусціў Ч. Мадайчык. Азначаная праца носіць яскрава выражаную ідэалагічную накіраванасць, згодна з якой памешчыкі аб’яўляліся крайнімі рэакцыянерамі і эксплуататарамі. Разам з тым выданне заснавана на шырокай крыніцавай базе, утрымлівае багатыя статыстычныя і фактыалагічныя звесткі і таму не страціла сваёй навуковай карысці і можа надалей выкарыстоўвацца навукоўцамі пры разглядзе дадзенага пытання пры ўмове прымянення сучасных навуковых падыходаў [17]. Аўтар разглядаемай кнігі ў цэлым ацэньвае тагачасны пануючы рэжым у Польшчы як выразна буржуазна-памешчыцкі і адпаведна абараняючы інтарэсы менавіта і выключна гэтых груп.

Неабходна звярнуць увагу на тое, што прадстаўнікі польскай гістарычнай навукі часоў Польскай Народнай Рэспублікі ў сваіх ацэнках буйнога землеўладання вымушана ішлі адпаведна падыходам савецкай гістарыяграфіі, таму памешчыкі як клас атрымалі, па сутнасці, выключна адмоўныя ацэнкі.

Сярод прадстаўнікоў польскай гістарыяграфіі сучаснага этапа памешчыкамі міжваеннай Польшчы перш за ўсё займаецца Б.У. Галка, які з’яўляецца аўтарам грунтоўных прац па дадзеным пытанні. Азначанае выданне ўтрымлівае шмат статыстычнага матэрыялу, дзякуючы чаму можна атрымаць цэласнае ўяўленне аб памеры і ролі памешчыцкага землекарыстання ў тагачаснай польскай эканоміцы, але, разам з тым, заходнебеларуская праблематыка разглядалася ім фрагментарна і недастаткова [18]. Надзвычай высокую каштоўнасць уяўляе яго наступнае выданне, прысвечанае дзейнасці памешчыцкіх прадстаўнікоў у Сейме міжваеннай Польшчы, іх падыходы да магчымых шляхоў вырашэння ў краіне аграрнага пытання і ажыццяўлення аграрных пераўтварэнняў, у тым ліку і ў Заходняй Беларусі, падкрэсліваецца іх кансерватыўная накіраванасць [19].

Гаспадарка польскіх памешчыкаў у 1921–1939 гг. знайшла сваё адлюстраванне таксама ў кнізе В. Ражкоўскага [20], які падрабязна паказаў вядзенне гаспадарання ў памешчыцкіх маёнтках, іх большую капіталістычную скіраванасць і злучанасць з рынкам у параўнанні з сялянскімі, а таксама больш высокую ўраджайнасць зямель буйной уласнасці, але пытанне разгляду функцыянавання памешчыцкіх гаспадарак на тэрыторыі Заходняй Беларусі разгледжана ім даволі фрагментарна.

Вобраз і стыль жыцця, найперш за ўсё, быт памешчыкаў, сямейныя і гаспадарчыя традыцыі на так званых Крэсах Паўночна-Усходніх яскрава паказаны ў працы Е. Жэнкевіча, асаблівую цікавасць выклікае аналіз функцыяналу і звычайных узаемаадносін абслугі памешчыцкіх маёнткаў, падкрэсліваецца, што нават пасля выхаду на пенсію многія з былых памешчыцкіх слуг у знак пашаны за шматгадовую адданую службу працягвалі і надалей жыць у гаспадарскіх памяшканнях навокал маёнтка [21].

Найбольш выбітным польскім даследчыкам, які займаўся вывучэннем развіцця сельскай гаспадаркі міжваеннай Польшчы, па праву застаецца М. Мешчанкоўскі, у працах якога ўсебакова адлюстраваны асноўныя моманты развіцця сельскай гаспадаркі на той час, прыведзены каштоўныя статыстычныя матэрыялы і звесткі адносна галоўных сацыяльных груп тагачасных землеўласнікаў, дзякуючы чаму назіралася выразная дыспрапорцыя ў землекарыстанні на тэрыторыі тагачаснай Заходняй Беларусі, што суправаджалася нацыянальнай дыскрымінацыяй і рэзка абвастрала існуючыя супярэчнасці [22–23].

К. Канопка з’яўляецца аўтарам некалькіх выданняў па праблеме развіцця сельскай гаспадаркі міжваеннай Польшчы, але ў цэлым яго кнігі структурна вельмі блізкія і падобныя, носяць навукова-папулярны і публіцыстычны характар. Памешчыцкае землекарыстанне ацэньваецца ў цэлым станоўча, падкрэсліваецца больш высокі ўзровень тут механізацыі і, у выніку, ураджайнасці ў параўнанні з сялянскімі гаспадаркамі, а таксама спадчынны характар памешчыцкага землекарыстання і нібыта іх тут цывілізатарская місія [24–26].

У. Міх засяродзіўся на вывучэнні асноўных напрамкаў дзейнасці Саюза памешчыкаў у 1916–1926 гг., паказаў асноўныя яго задачы і накірункі дзейнасці, падкрэслівае, што памешчыкі дзякуючы каардынацыі сваіх намаганняў змаглі, у выніку, актыўна і паспяхова абараняць і рэалізоўваць свае інтарэсы. У выданні разглядаецца пазіцыя памешчыкаў па розных тагачасных актуальных пытаннях грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага ладу, дзякуючы чаму можна стварыць, свайго роду, агульны сацыяльны партрэт тагачасных памешчыкаў, якія па прыродзе сваёй, у асноўным, былі кансерватарамі [27].

Ю. Жарноўскі вывучаў сацыяльную структуру польскага грамадства міжваеннага перыяду, адзначаў, што памешчыкі былі найбольш заможнай і ўплывовай яго часткай, дзякуючы высокай арганізаванасці і каардынацыі аказвалі вызначальны ўплыў на грамадска-палітычнае развіццё краіны. Разам з тым, памешчыкі па сваёй сутнасці таксама не былі адзіным класам, сярод іх, у тым ліку, захоўваліся істотныя супярэчнасці, таму асаблівую цікавасць уяўляюць імкненні прадстаўнікоў бяднейшай часткі памешчыкаў паказаць сябе не менш заможнымі, чым іншыя іх калегі, што часам атрымлівала даволі карыкатурныя формы [28].

Надзвычай высокую навуковую вартасць уяўляць зборнікі навуковых прац, прысвечаныя культурнай спадчыне памешчыкаў, дзе асветлены розныя бакі дзейнасці паноў Польшчы ў міжваенны перыяд, паказаны іх быт і традыцыі, асноўныя напрамкі дзейнасці, у тым ліку і дабрачынная. Аўтарамі зборнікаў падкрэсліваецца, што памешчыкі ўнеслі вялікі ўклад у развіццё матэрыяльнай і духоўнай культуры дзякуючы будаўніцтву вялікай колькасці магнацкіх рэзідэнцый і памешчыцкіх маёнткаў, многія з якіх з’яўляюца выдатнымі помнікамі архітэктуры, а таксама дзякуючы фундацыям на пабудову касцёлаў, манастыроў і цэркваў. Разам з тым, многія памешчыкі шмат часу прысвячалі рознага роду забавам, перш за ўсё паляванням, вымушаны ўдзел у якіх у якасці дапаможнага персаналу прыймалі навакольныя сяляне [29]. Асаблівай увагі ў гэтым плане заслугоўвае артыкул А. Ліхаровіча, у якім паказаны стаўленне і ўдзел польскіх памешчыкаў у рэалізацыі аграрнай рэформы і асноўныя супярэчнасці, якія ўзнікалі на гэтым шляху. Справа датычылася, перш за ўсё, памераў парцэляцыі – перадачы сялянам часткі памешчыцкіх зямель, пры гэтым памешчыкі выразна разумелі яе неабходнасць, улічваючы ўсеагульны рэвалюцыйны ўздым пасля падзей 1917 г. у Расіі, але адзначалі, што працэс гэты павінен быць надзвычай прадуманым і паступовым [30].

У працах З. Тамчонак разглядаецца становішча сельскай гаспадаркі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., матэрыяльнае становішча асноўных тагачасных груп землекарыстальнікаў, у тым ліку і памешчыкаў (асабліва на Палессі). Прыведзены звесткі аб працэнтных адносінах вагі памешчыцкага землекарыстання адносна паветаў Палескага ваяводства. У выніку падкрэсліваецца, што памешчыкі былі апорай польскіх улад на вёсцы, але ўсім станавілася відавочным, што поўнае захаванне памешчыцкага землеўладання непазбежна выкліча далейшы рост сацыяльнай напружанасці. У сувязі з гэтым, за разглядаемы перыяд вага памешчыцкага землеўладання скарацілася, але даволі нязначна [31–32].

У цэлым сярод прадстаўнікоў польскай гістарыяграфіі ў рэгіянальным аспекце найбольш вялікую ўвагу выклікае Палескае ваяводстве, якое, нягледзячы на параўнальную эканамічную адсталасць, захоўвала непаўторнае хараство і прыцягальнасць, галоўным чынам, у незвычайна майстэрскіх спосабах выжывання мясцовага насельніцтва ў далёка не самых спрыяльных прыродных умовах (перш за ўсё масавай забагненасці) і стварэнню ўнікальнай духоўнай і матэрыяльнай культуры. што неаднаразова падкрэсліваецца ў шматлікіх працах польскіх даследчыкаў, прысвечаных дадзенаму рэгіёну.

Першым аўтарам буйной комплекснай працы па сацыяльна-эканамічным развіцці Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. стаў Е. Тамашэўскі, які адзначаў дамінаванне памешчыцкага землеўладання на тэрыторыі рэгіёна ў азначаны час, пры гэтым падкрэсліваў, што большасць з іх вяла капіталістычную гаспадарку, што з’яўлялася ўзорам для навакольных сялян і, такім чынам, спрыяла павышэнню эфектыўнасці іх гаспадарання [33]. У даследаванні падкрэсліваецца спецыфіка ўзаемаадносін памешчыкаў і сялян на Палессі, напрыклад, адзначаецца, што адзін з мясцовых абшарнікаў доўгі час не мог дамовіцца з сялянамі аб выкананні работ на яго землях, але потым, калі ён выставіў ім пачастунак з алкаголем, то сяляне пагадзіліся. У выніку ўсё гэта абыйшлося землеўладальніку нават нашмат танней, але сяляне былі задаволены тым, што ён выказаў ім такім чынам павагу. Нямала месца памешчыцкаму землеўладанню на Палессі прысвечана і ў адпаведнай працы В. Сляшыньскага. У выданні падкрэсліваецца, што дзякуючы існаванню тут буйных памешчыцкіх гаспадарак навакольнае сялянства было забяспечана працай, што дазваляла яму пазбегнуць масавага голада, які станавіўся амаль непазбежным у выпадку частых неўраджаяў у асабістых гаспадарках [34]. П. Ціхарацкі разглядаў палітычныя працэсы на Палессі ў міжваенны перыяд, у тым ліку і аграрнае пытанне, якое з’яўлялася адным з найбольш вострых і патрабуючых тэрміновага вырашэння. У выданні падкрэсліваецца, што ва ўмовах захавання ў рэгіёне буйнога памешчыцкага землеўладання многія мясцовыя палітычныя сілы актыўна выступалі за надзяленне сялян гэтай зямлёй, што выклікала актыўны сялянскі рух і дыскусію ў тагачасным перыядычным друку і публіцыстыцы [35].

**Заключэнне.** Нягледзячы на даволі істотную колькасць навуковых прац, у якіх тым ці іншым чынам закранаецца памешчыцкае землекарыстанне на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., многія яшчэ яго бакі так і засталіся недаследаванымі (асабліва, памеры аплаты сялянскай працы і ўзамаадносіны сялян з памешчыкамі і іх дапаможным персаналам) і патрабуюць вывучэння адпаведна сучасным навуковым падыходам у рамках асобнай буйной работы.

Прадстаўнікамі айчыннай гістарыяграфіі савецкага перыяду рабілася адназначна негатыўная ацэнка ролі памешчыкаў у развіцці мясцовай сельскай гаспадаркі, што адбывалася выключна за кошт няшчаднай эксплуатацыі навакольнага сялянства, таму памешчыцкае буйное землеўладанне паказвалася як перажытак часоў феадалізму, які павінны быць у выніку ліквідаваны адначасова з бясплатным надзяленнем зямлёй патрабуючых таго сялян. Такія ж высновы характэрны і для тагачаснай польскай гістарычнай навукі.

На сучасным этапе развіцця айчыннай гістарычнай навукі ідзе паступовае пераасэнсаванне месца і ролі памешчыцкага землеўладання ў сацыяльна-эканамічным развіцці Заходняй Беларусі азначанага перыяду, таму

разам з вылучэннем безумоўных адмоўных бакоў паказваюцца таксама і станоўчыя рысы, перш за ўсё, больш высокая ўраджайнасць і ўзровень механізацыі, а таксама актыўны ўдзел у дабрачыннай дзейнасці адносна сваіх сялян з боку некаторых заходнебеларускіх памешчыкаў. Аналагічная тэндэнцыя прасочваецца і ў польскай гістарыяграфіі, якая, разам з тым, засяроджваецца найперш на разглядзе памешчыцкіх гаспадарак непасрэдна на тэрыторыі этнічнай Польшчы, але пры гэтым асаблівую ўвагу надае спадчынным правам і памешчыцкай паўсядзённасці. У сувязі з гэтым патрабуецца далейшае вывучэнне разглядаемага пытання і падрыхтоўка комплекснага спецыялізаванага выдання з паказам супярэчлівага становішча і ролі буйнога землеўладання ў Заходняй Беларусі міжваеннага перыяду, першасную ўвагу пры гэтым неабходна надаць паказу ўзаемадносін сялян з памешчыкамі і расцэнак аплаты сялянскай працы.

ЛІТАРАТУРА


1. Кахновіч В.А. Адлюстраванне праблем буйной землеўласнасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў беларускай гістарыяграфіі // Беларусь у эпоху геапалітычных і сацыяльных зрухаў Новага і Навейшага часу: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 22 лістап. 2019 г. – Мінск: БДУ, 2019. – С. 49–53.
2. Гак Л. Аграрная палітыка польскай буржуазіі ў Заходняй Беларусі. – Мінск: Дзярж. выд-ва БССР, Партмассектар, 1933. – 95 с.
3. Гольдштейн И.И. Аграрные отношения в бывшей Польше, Западной Украине и Западной Белоруссии. – М.: Госиздат, 1940. – 296 с.
4. Мацко А.Н. Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнета буржуазии и помещиков (1918–1939 гг.). – Минск: Беларусь, 1972. – 334 с.
5. Сорокин А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.). – Минск: Наука и техника, 1968. – 199 с.
6. Кухарев Б.Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919–1939 гг.). – Минск: Выш. шк., 1975. – 110 с.
7. Полуян И.В. Западная Белоруссия в период экономического кризиса 1929–1933 гг. – Минск: Навука і тэхніка, 1991. – 205 с.
8. Мисиюк В.С. Крупные землевладельцы Западной Белоруссии в контексте общественной трансформации (1921–1939) // Системная трансформация общества: инновации и традиции: сб. науч. тр. каф. социально-гуманитарных наук. – Брест: БрГТУ, 2015. – Вып. 11. – С. 62–66.
9. Смалянчук А.Ф. Раман Скірмунт (1868–1939): жыццяпіс грамадзяніна Краю. – Мінск: Зміцер Колас, 2018. – 692 с.
10. Вабішчэвіч А.М. Давыд-Гарадоцкая ардынацыя Радзівілаў у 1921–1939 гг. // Беларускі гістарычны часопіс. – 2015. – № 10. – С. 20-33.
11. Вабищевич А. Усадьба Радзивиллов в Маньковичах // Radziwiłłowie. Obrazy literackie. Biografie. Świadectwa historyczne. – Lublin: Uniwersytet M. Curie-Skłodowskiej, 2003. – S. 455–463.
12. Вабішчэвіч А.М. Вёска Рубель на Століншчыне: гісторыка-краязнаўчы нарыс. – Брэст: БрДУ, 2021. – 281 с.
13. Папко В.М. Давыд-Гарадоцкая ардынацыя князёў Радзівілаў у 1905–1939 гг. // Весн. Брэс. дзярж. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2011. – № 2. – С. 32–40.
14. Папко В.М. Род Дзяконскіх і іх маёнткі на Брэстчыне ў XIX–XX стст. – Брэст: Альтернатива, 2011. – 245 с.
15. Калеснiковіч Т.А. Памешчыцкая гаспадарка на тэрыторыі Камянецкага раёна ў міжваенны перыяд (1921–1939) // Моладзь Берасцейшчыны: зб. навук. прац. – Брэст: Академия, 2006. – С. 94–99.
16. Здановіч У.В. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Валовельскай гміны ў 1921–1939 гг. // Берасцейскі хранограф: зб. навук. прац. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2004. – Вып. 4. – С. 60–63.
17. Madajczyk Cz. Burżuazyjno-obszarnicza reforma rolna w Polsce: (1918–1939). – Warszawa: Książka i Wiedza, 1956. – 463 s.
18. Galka B.W. Ziemianie i ich organizacje w Polsce lat 1918–1939. – Toruń: Adam Marszalek, 1997. – 214 s.
19. Galka B.W. Ziemianie w parlamencie II Rzeczypospolitej. – Toruń: Adam Marszalek, 1999. – 185 s.
20. Roszkowski W. Gospodarcza rola większej prywatnej własności ziemskiej w Polsce 1918–1939. – Warszawa: Szkoła Główna Planowania i Statystyki, 1986. – 431 s.
21. Żenkiewicz J. Dwór polski i jego otoczenie: kresy Północno-Wschodnie. – Toruń: Adam Marszałek, 2008. – 171 s.
22. Mieszczankowski M. Rolnictwo II Rzeczypospolitej. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1983. – 447 s.
23. Mieszczankowski M. Struktura agrarna Polski międzywojennej. – Warszawa: Państ. Wydaw. Nauk., 1960. – 430 s.
24. Konopka K. Mechanizm reform agrarnych w Drugiej Rzeczypospolitej Polskiej (1918–1939). – Białystok: Wydaw. Politech. Białostockiej, 2010. – 143 s.
25. Konopka K. Reformy agrarne a mechanizm rozwoju społeczno-gospodarczego w Drugiej Rzeczypospolitej Polskiej (1918–1939). – Białystok: Wydaw. Politech. Białostockiej, 2014. – 238 s.
26. Konopka K. Reformy agrarne w Drugiej Rzeczypospolitej Polskiej oraz ich wpływ na rozwój społeczno-gospodarczy Polski (1918–1939). – Białystok: Wydaw. Politech. Białostockiej, 2012. – 212 s.
27. Mich W. Związek ziemian w Warszawie 1916–1926. – Lublin: Uniwersytet Marii Curie-Skłodowskiej, 2007. – 468 s.
28. Żarnowski J. Społeczeństwo Polski międzywojennej. – Warszawa: Wiedza Powszechna, 1969. – 173 s.
29. Ziemiaństwo polskie 1920–1945: zbiór prac o dziejach warstwy i ludzi / pod red. J. Leskiewiczowej. – Warszawa: Państ. Wydaw. Nauk., 1988. – 368 s.
30. Lichorowicz A. Polskie reformy rolne 1920–1944 a ziemiaństwo // Dziedzictwo. Ziemianie polscy i udział ich w życiu narodu. – Kraków: Znak, 1995. – S. 85–97.
31. Tomczonek Z. Ruch ludowy na kresach północno-wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej. – Białystok: Wydaw. Politech. Białostockiej, 1996. – 247 s.
32. Tomczonek Z. Wieś Poleska 1918–1939 // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблемы развіцця заходняга рэгіёну Беларусі: мат. міжнар. навук.-практ. канф., Брэст, 23–24 крас. 1998 г. У 2 ч. / БрДУ імя А.С. Пушкіна. – Брэст: Выд-ва С. Лаўрова, 1998. – Ч. 2. – С. 110–115.
33. Tomaszewski J. Z dziejów Polesia, 1921–1939: zarys stosunków społeczno-ekonomicznych. – Warszawa: Państ. Wydaw. Nauk., 1963. – 208 s.

34. Śleszyński W. Województwo Poleskie. – Kraków: Avalon, 2014. – 335 s.
35. Cichoracki P. Województwo Poleskie 1921–1939. Z dziejów politycznych. – Łomianki: LTW; Wrocław: IH Uniwersytetu Wrocławskiego, 2014. – 477 s.

*Пастуріў 30.08.2023*

# ИСТОРИОГРАФИЯ ПОМЕЩИЧЬЕГО ЗЕМЛЕВЛАДЕНИЯ НА ТЕРРИТОРИИ ЗАПАДНОЙ БЕЛАРУСИ В 1921–1939 гг.

***канд. ист. навук, доц. В.П. ГАРМАТНЫЙ***
***(Институт истории НАН Беларуси, Минск)***

*На протяжении 1921–1939 гг. Западная Беларусь являлась частью народно-хозяйственного комплекса межвоенной Польши с выразительным доминированием здесь сельского хозяйства и сохранением большого количества помещичьих хозяйств, рядом с которыми существовали многочисленныме хозяйства малоземельных крестьян, надеющихся получить землю имения. Не смотря на значительный вклад помещиков в развитие местного хозяйства, как отечественные, так и зарубежные исследователи по разным причинам сосредотачивали своё внимание в первую очередь на положении местного крестьянства, в то время как помещичье хозяйство оставалось за рамками их внимания, подаваясь достаточно односторонне и субъективно.*

***Ключевые слова:*** *помещики, землевладение, урожайность, латифундия, имение, Полесье.*

# HISTORIOGRAPHY OF LANDLORD LAND OWNERSHIP ON THE TERRITORY OF WESTERN BELARUS IN 1921–1939

***V. HARMATNY***
***(Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk)***

*During 1921–1939 Western Belarus was a part of the national and economic complex of interwar Poland with a clear dominance of agriculture and the preservation of a large number of property owners, close to whom there was a large number of landless peasants who hoped to get their land. Despite the significant contribution of landowners to the development of the local economy, as domestic as foreign researchers for various reasons, focused their scientific attention primarily on the position of the local peasantry, while the landlords economy remained out of the spotlight and was presented rather one-sidedly and subjectively.*

***Keywords:*** *landowners, land ownership, productivity, economy, large estate, property, Palesse.*